Праекты. Нацыянальная бібліятэка Беларусі сумесна з Нацыянальнай акадэміяй навук адкрылі новы сезон інтэрактыўных лекцый «Беларуская музыка ў сусветнай мастацкай прасторы», паведамляе БелТА. «Гадзіна музыкі» — гэта цыкл бясплатных мерапрыемстваў, прызначаных для шырокага кола слухачоў. Музыказнаўцы Акадэміі навук пазнаёмяць наведвальнікаў з гісторыяй беларускай музыкі XIX — пачатку XX ст., адкрыюць малавядомыя факты пра творчасць Станісла Манюшкі, Фларыяна Міладоўскага і Міхала Клеафаса Агінскага. Этнамузыколагі раскажуць пра каляндарна-абрадавыя традыцыі беларусаў і падзеляцца ўнікальнымі архіўнымі і экспедыцыйнымі аўдыя- і відэаматэрыяламі.